# ДА ПЫТАННЯ АБ АКТУАЛЬНАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН МІНУЛАГА: ВОПЫТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

*Дземідовіч А.В.,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*ст. выкладчык кафедры міжнародных адносін*
*факультэта міжнародных адносін БДУ*

Тэндэнцыі развіцця сучасных міжнародных адносін як сукупнасці разнастайных сфер знешнепалітычнай дзейнасці выклікаюць цікавасць як спецыялістаў (гісторыкаў, палітолагаў, юрыстаў, эканамістаў і інш.), так і людзей, прафесійная дзейнасць якіх не звязана непасрэдна з вышэйадзначаным. Такая зацікаўленасць тлумачыцца лёгка: гэта наш час, тая рэчаіснасць, у якой мы жывём, і, зразумела, што сучасны чалавек мае патрэбу быць дасведчаным адносна таго, што адбываецца ў свеце, жадае арыентавацца ў складаных міждзяржаўных стасунках.

Чым жа можна патлумачыць важнасць і неабходнасць вывучэння міжнародных адносін і знешнепалітычных сувязей значна ранейшага перыяду? У прыватнасці, гаворка ідзе аб часах Вялікага Княства Літоўскага, калі яно існавала як самастойная краіна, а таксама ў складзе Рэчы Паспалітай, – аб знешнепалітычным вопыце тых дзяржаўных адзінак, у склад якіх калісьці ўваходзілі беларускія землі.

У пошуках-разважаннях над дадзеным пытаннем хацелася б адзначыць наступныя моманты.

Неабходнасць даследавання міжнародных адносін мінулага вынікае з патрэбы асэнсавання вытокаў тых знешнепалітычных рэалій, якія мы маем на сённяшні дзень. Папярэдні вопыт, сапраўды, можа быць карысным, і, несумненна, дазваляе ўлічыць урокі мінулага. Гэта з’яўляецца надзвычай актуальным асабліва калі мы кажам пра Вялікае Княства Літоўскае, якое з’яўлялася шматэтнічнай дзяржавай, знітаваўшай у адно лёсы шэрагу краін.

Больш таго, вывучаючы гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку і знешнепалітычную, мы яскрава пераконваемся ў наяўнасці ў Рэспубліцы Беларусь глыбокіх традыцый дзяржаўнасці. Апошняе ў сваю чаргу дапамагае абгрунтаваць і ўмацаваць дзяржаўную ідэнтычнасць і правасуб’ектнасць у міжнародным супольніцтве. Для самастойнай

Беларусі, адносна маладой незалежнай дзяржавы, якая замацавала ўласны статус як паўнапраўнага суб'екта міжнародных адносін, дастаткова важным з'яўляецца доказ даўно сфарміраваных традыцый палітычнай культуры, у тым ліку і ў знешнепалітычнай сферы. Так, і дыпламатыя як сродак ажыццяўлення знешняй палітыкі дзяржавы, і практычная рэалізацыя знешнепалітычных прыярытэтаў Вялікага Княства Літоўскага (асабліва перыяду ранняга Новага часу) знаходзіліся на належным узроўні, нічым не саступаючы агульнаеўрапейскаму. Гэта праяўлялася ў наяўнасці дасканалых юрыдычных помнікаў (напрыклад, Статутаў ВКЛ), якія рэгламентавалі, сярод іншага, і знешнепалітычную сферу; функцыянаванні органаў дзяржаўнай улады, да кампетэнцыі якіх належала ажыццяўленне знешнепалітычных сувязей; панаванні высокаразвітай свядомасці палітычна актыўнай часткі грамадства – шляхецкага саслоўя. Асобна варта ўзгадаць практычную дзейнасць дыпламатаў таго часу, сярод якіх выключнай шматграннасцю вылучаецца постаць Льва Сапегі – дыпламата, юрыста, вайсковага дзеяча, дзяржаўнага рэфарматара, мысліцеля-філосафа.

Варта ўзгадаць аксіялагічны аспект. Напрыклад, вопыт Вялікага Княства Літоўскага пераканаўча сведчыць пра важнасць, каштоўнасць і рацыянальнасць узважанай знешняй палітыкі, прыярытэт гуманістычных пачаткаў у фарміраванні яе курсу і практыцы міжнародных адносін. Так, Беларусь ніколі не з'яўлялася пачынальніцай войнаў, а толькі мужна і аддана бараніла свой гонар, сваю незалежнасць. Так было заўсёды. Так ёсць і зараз. Міралюбівая сутнасць знешняй палітыкі сучаснай Беларусі з'яўляецца фактам, што замацавана на заканадаўчым узроўні ў Канстытуцыі і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь [1; 2].

Кіруючыся пры вывучэнні спадчыны каштоўнасным падыходам, які дапамагае зафіксафаць сацыяльна значныя і актуальныя моманты ў досведзе мінулага, нельга не ўзгадаць і такую рысу грамадства як талерантнасць (у вузкім і шырокім значэнні гэтага слова). Адлюстравалася яна і ў сферы міжнародных адносін і знешняй палітыкі.

Не магчыма абмінуць увагай і геапалітычны фактар. Месца зямель Беларусі – паміж Захадам і Усходам. На скрыжаванні. На скрыжаванні гандлёвых шляхоў, ідэй. На скрыжаванні адпаведных уплываў. Гэта ў многім прадвызначыла лёс Беларусі як дзяржавы, сфарміравала яе адметнасць. Пільны позірк у мінулае з мэтай

прааналізаваць знешнепалітычныя кантакты Вялікага Княства Літоўскага з іншымі актарамі міжнародных адносін дазваляе ўбачыць сінтэз заходніх і ўсходніх традыцый, вынік чаго адлюстраваўся, бадай што, ва ўсіх грамадскіх сферах: культурнай, эканамічнай, палітычнай. Тым самым, даследуючы гісторыю знешнепалітычных сувязей мінулага, мы можам знайсці адказ, як не згубіць сябе на гэтым гістарычным скразняку.

Відавочна, што пры даследаванні акрэсленай праблемы выконваюцца ўсе тыя функцыі гісторыі, якія вызначаюцца сучаснай метадалогіяй гісторыі: сацыяльнай памяці, навукова-пазнавальная, выхаваўчая, палітыка-ідэалагічная [3, с. 28].

Такім чынам, гісторыя міжнародных адносін Сярэднявечча і ранняга Новага часу з'яўляецца арганічнай часткай гісторыі як навукі і гісторыі як сукупнасці падзей, якія разгортваюцца ў прасторы і часе, без асэнсавання якой, як вядома, не магчыма будучыні.

Літаратура

1. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.) // Национальный интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа : http://pravo.by/main.aspx?guid=6351. – Дата доступа : 04.06.2013.
2. Концепция национальной безопасности Республики Беларусь // Официальный сайт Министерства обороны Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа : http://mod.mil.by/koncep.html. – Дата доступа : 04.06.2013.
3. Сидорцов, В.Н. Методология истории : количественные методы и информационные технологи : учеб.-метод. пособие / В.Н. Сидорцов. – Минск : БГУ, 2003. – 143 с.